ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ВІЦЕБСКІ РАБОЧЫ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА КАМІТЭТАЎ КП(б)Б, АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА СОВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 36 (7113) | Пятніца, 5 мая 1944 г. | Цана 20 кап.

**Сёння дзень большэвіцкага друку!**

*„Друк павінен расці не па днях, а па гадзінах,—гэта самая вострая і самая моцная зброя нашай партыі“ (Сталін).*

## Дзень большэвіцкага друку

Сёння дзень большэвіцкага друку. Як і ў мінулым годзе, мы сустракаем дзень большэвіцкага друку ў абстаноўцы вялікай Айчыннай вайны, у абстаноўцы гістарычных перамог Чырвонай Арміі над нямецка-фашысцкімі захватчыкамі.

Совецкі друк—вострая і моцная зброя нашай партыі. Ён дзецішча Леніна і Сталіна. На ўсіх этапах развіцця большэвіцкай партыі, будаўніцтва совецкай дзяржавы Ленін і Сталін удзелялі велізарнейшую ўвагу большэвіцкаму друку, накіроўвалі яго, кіравалі ім.

З першых дзён вайны большэвіцкае друкаванае слова знаходзіцца на перадавой лініі барацьбы з гітлераўскімі разбойнікамі. Яно палка і страсна заклікае воінаў Чырвонай Арміі да стойкасці, упорства, бязмежнай храбрасці, смеласці і рашучасці ў наступленні. Яно заклікае мільёны совецкіх працаўнікоў у тылу—на заводах, фабрыках, транспарце, у калгаснай вёсцы—да яшчэ больш самаадданай працы, беспераўыннага павелічэння выпуска прадукцыі для Чырвонай Арміі, далейшага ўзмацнення ваеннай магутнасці совецкай краіны.

Асабліва цяпер у дні вайны роля большэвіцкага друку, як калектыўнага прапагандыста, агітатара і арганізатара, значна ўзрасла. Галоўнейшая першаступовая задача ў сучасны момант—мабілізацыя ўсіх сіл нашага народа на выкананне гістарычнага першамайскага загада таварыша Сталіна. Глыбока растлумачваць змест загада працоўным масам—вось што зараз з'яўляецца галоўным у рабоце большэвіцкага друку.

Голас большэвіцкага друку гучыць у тылу ворага, у часова захваченых ім совецкіх раёнах. Дзесяткі партызанскіх газет, падпольныя раённыя газеты нясуць нашым братам і сёстрам, часова падпаўшым пад гнёт нямецкіх захватчыкаў, праўду аб гістарычных перамогах Чырвонай Арміі, аб жыцці на совецкай зямлі, выкрываюць фашысцкую прапаганду, заклікаюць да барацьбы супроць ненавісных акупантаў.

Асабліва цяпер пачэсны задачы нашых газет. Зараз калгасы нашай вобласці ўступілі ў паласу вясенне-палявых работ. Раённыя газеты абавязаны шырока асвятляць на сваіх старонках працоўны ўздым калгаснай вёскі, якая змагаецца за высокі ваенны ўраджай.

Многія раённыя газеты нашай вобласці да дня друку прышлі з сур'ёзнымі дасягненнямі ў рабоце. Добрыя прыклады паказваюць газеты „Ленінскі Сцяг“, Лёзненскага раёна і „Большэвіцкі Шлях“, Полацкага раёна. Яны глыбока і змястоўна паказваюць на сваіх старонках вопыт перадавікоў сельскай гаспадаркі, спаборніцтва іх у барацьбе за заваяванне высокіх ураджаеў.

У першамайскім загадзе Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Совецкага Саюза таварыш Сталін сказаў: „Справа заключаецца зараз у тым, каб ачысціць ад фашысцкіх захватчыкаў усю нашу зямлю і аднавіць дзяржаўныя граніцы Совецкага Саюза па ўсёй лініі, ад Чорнага мора да Барэнцава мора“.

Большэвіцкі друк павінен мабілізаваць усе сілы і энергію народных мас на выкананне ўказанняў правадыра. Неабходна яшчэ вышэй узняць прапагандысцкую і арганізатарскую работу нашага раённага друку. Газеты павінны выступаць арганізатарамі спаборніцтва калгасаў і прадпрыемстваў за расшырэнне вытворчасці для патрэб фронта і краіны, за перавыкананне вытворчых планаў.

Большэвіцкі друк моцны тым, што высока трымае непераможны сцяг Леніна—Сталіна. Пад гэтым сцягам наш друк—магутная зброя ў барацьбе супроць нямецка-фашысцкіх захватчыкаў—даб'ецца новых поспехаў.



Таварышы В. І. Ленін і І. В. Сталін.

*У Соўнаркоме Саюза ССР*

## Аб выпуску Трэцяй Дзяржаўнай Ваеннай Пазыкі

У мэтах прыцягнення дадатковых сродкаў для абароны краіны Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанавіў:

1. Выпусціць Трэцюю Дзяржаўную Ваенную Пазыку на суму 25 мільярдаў рублёў, тэрмінам на 20 год.

2. Абліагацыі пазыкі і даходы ад іх, у тым ліку выйгрышы, аслабаніць ад абкладання дзяржаўнымі і мясцовымі падаткамі і зборамі.

3. Зацвердзіць прадстаўленыя Народным Камісарыятам Фінансаў Саюза ССР умовы выпуску Трэцяй Дзяржаўнай Ваеннай Пазыкі.

## Працоўныя вітаюць выпуск Трэцяй Дзяржаўнай Ваеннай Пазыкі

Па няпоўных даных, з часу перадачы па радыё пастановы Ўрада СССР аб выпуску Трэцяй Дзяржаўнай Ваеннай Пазыкі, у першы-ж дзень — 4 мая сума падпіскі рабочых, служачых і калгаснікаў вызваленых раёнаў нашай вобласці дасягнула 1 мільёна 435 тысяч рублёў.

Падпіска прадаўжаецца.

* * *

З вялікім уздымам праходзіць падпіска на Трэцюю Дзяржаўную Ваенную Пазыку сярод рабочых і служачых Віцебскай гарадской групы.

На 5 мая агульная сума падпіскі складае 1 мільён 153 тысячы рублёў або 127,6 процанта да фонда заработнай платы.

### Падпіску замацоўваюць рублём

З выключным уздымам прайшла падпіска на Трэцюю Дзяржаўную Ваенную Пазыку сярод калектыва работнікаў Аблза.

За некалькі хвілін, сума падпіскі тут дасягнула 25 тысяч рублёў, значна перавысіўшы фонд заработнай платы.

Натхнёная вялікімі перамогамі гераічнай Чырвонай Арміі і жадаючы як мага хутчэй дасягнуць канчатковай перамогі над ворагам, старшы зоатэхнік тав. Пузырэўская О. І. падпісалася на пазыку на месячны заработак і адразу-ж унесла наяўнымі грашыма.

ШАБУНЯ.

### На пазыку перамогі

Калектыў работнікаў Облгандлю сустрэў гістарычнае паведамленне Совецкага Ўрада аб выпуску Трэцяй Дзяржаўнай Ваеннай Пазыкі з велізарнай радасцю.

Даць у пазыку дзяржаве не менш месячнага заработку—такія былі адзіныя думкі кожнага.

Падпіска прайшла хутка і арганізавана. 8765 рублёў або 120,7 процанта да фонда месячнага заработку далі работнікі абласнога гандлю роднай дзяржаве на ўзмацненне яе абароннай магутнасці.

ГРЫНБЕРГ.

### У першы дзень

ЛЁЗНА. Пастанова Ўрада СССР аб выпуску Трэцяй Ваеннай Пазыкі адабраецца ва ўсіх вызваленых калгасах раёна.

Па няпоўных даных, у першы дзень калгаснікі раёна падпісаліся на новую пазыку на суму 133.000 рублёў, з іх 56.000 рублёў унеслі наяўнымі грашыма.

Падпіска прадаўжаецца.

### УНОСЯЦЬ ПА 1000 РУБЛЁЎ

Учора адбыўся сход калгаснікаў сельгасарцелі „Віцебскі Пролетарый“ (Лёзненскі раён), прысвечаны пастанове Ўрада аб выпуску Трэцяй Дзяржаўнай Ваеннай Пазыкі.

Першай выступіла калгасніца Параскоўя Пярцова, якая заявіла, што ўносіць на новую пазыку 1000 рублёў. Па яе прыкладу, тут-жа на сходзе, падпісаліся на пазыку Грынкіна, Дзядзюшкін, Картавенка, Карнілаў па 1000 рублёў кожны.

Падпіска і ўзносы наяўнымі грашыма прадаўжаюцца.

